# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Гэты тыдзень можа аказацца поўны спакус. Не выключана, што вас паспрабуюць абдурыць ці выкарыстаць у сваіх мэтах. Будзьце напагатове і не трапляйцеся на кручок. Пастарайцеся не сыходзіць ад цяжкай размовы з калегамі і з начальствам. Толькі не бярыце на сябе дадатковых абавязацельстваў. Пажадана на працягу тыдня паспрабаваць уціхамірыць свае амбіцыі, будзьце разумныя ў расходах.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні вы будзеце проста незаменныя ўсюды, дзе вас ведаюць, і, магчыма, у пары-тройцы месцаў, дзе пакуль пра вас яшчэ і не здагадваюцца. Чакаюцца самыя спрыяльныя змены ў плане кар'еры. У вас з'явіцца новы знаёмы, пастаўцеся да яго з добразычлівасцю, і ён акажа неацэнную паслугу. Верагодныя ўдалыя перагаворы і цікавыя падарожжы. Адзіная перасцярога: ваша паспяховасць можа выклікаць раздражненне, таму будзьце цярплівыя і не паддавайцеся на правакацыі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Безумоўна, цяпер ваш час. Ён садзейнічае раскрыццю вашага творчага патэнцыялу, назапашванню сіл і энергіі. Верагодныя паездкі, вандраванні, сустрэчы і спатканні, якія ўзбагацяць вас разнастайнымі ўражаннямі. Адчуеце гармонію і радасць жыцця. Стаўка на цярпенне і спакойнае чаканне прынясе поспех у асабістым жыцці.

**РАК.** Вам будзе спадарожнічаць поспех у прасоўванні новых ідэй і арыгінальных распрацовак. Прыхільная ўвага начальства і калег вам забяспечана. Паберажыце добрыя адносіны паміж блізкімі вам людзьмі ад крыўдаў і непаразуменняў. Падзеі, пачатак якім будзе пакладзены на гэтым тыдні, могуць набыць нечаканы характар. Пятніца і субота — удалыя дні для загарадных паездак.

**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні спатрэбіцца такія якасці, як уважлівасць, паслядоўнасць у сваіх дзеяннях і разважлівасць. У панядзелак новыя справы лепш не пачынаць, лепей разабрацца з незавершанымі праектамі. Пастарайцеся менш спрачацца з начальствам. Давядзецца разбірацца з праблемамі дзяцей. У чацвер паклічце на дапамогу інтуіцыю, камунікабельнасць і дыпламатычныя здольнасці, тады зможаце выкарыстаць сітуацыю, якая склалася, вам на карысць.

**ДЗЕВА.** Не падпускайце да сябе блізка спадарыню ляноту, інакш яна перашкодзіць вам дасягнуць вынікаў. У першай палове тыдня не трэба строіць грандыёзных планаў, лепш займіцеся выключна паўсядзённымі бягучымі справамі. Будзьце мудрыя і прадбачлівыя, старайцеся не дапускаць у адносінах з партнёрамі праблем і канфліктных сітуацый. Высветліце і абазначце выразныя мэты. Не трэба гнацца адразу за ўсімі зайцамі. Выхадныя схіляюць да сямейных заняткаў, хатняга адпачынку і да сустрэч з сябрамі.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні найбольш спрыяльная сітуацыя будзе для кахання і рамантыкі. Не прыспешвайце падзеі. Лепш праявіце асцярожнасць — ваш несуцішны тэмперамент і гарачлівасць пагражаюць прывесці да сур'ёзных сварак з тымі, хто важны для вас. Аўторак — удалы дзень для пачатку самых вялікіх і важных спраў. Усё, чаму пакладзены пачатак у гэты дзень, будзе ўдавацца асабліва добра. У чацвер вас чакае прыемнае спатканне.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень у цэлым канструктыўны і спрыяльны для вас. Можна чакаць павышэння на службе і прыбаўку да зарплаты. Ваш аўтарытэт у калег і начальства расце. Вам даручаюць усё больш адказныя заданні. І вы з імі выдатна спраўляецеся. У доўгія выхадныя з'язджайце далей ад мітусні і штодзённасці.

**СТРАЛЕЦ.** Неабходна звярнуць на работу пільную ўвагу, пажадана заняцца разграбаннем назапашаных спраў. Шмат часу давядзецца прысвяціць вырашэнню бягучых праблем, звязаных з фінансавай сферай. У аўторак паездкі і камандзіроўкі будуць на рэдкасць удалыя. Выхадныя параднююць. Гэта дні, калі магчымы сустрэчы з прыемнымі людзьмі, забавы і паходы ў госці. У суботу могуць адбыцца прыемныя падзеі ў жыцці вашай сям'і.

**КАЗЯРОГ.** У панядзелак пажадана сачыць за сваімі выказваннямі, інакш з'явіцца рызыка канфлікту. У гэты дзень вам можа спатрэбіцца дапамога сяброў і калег, будзе складана справіцца з вялікім аб'ёмам работы. У сераду магчымы добрыя навіны, звязаныя з асабістым жыццём. У чацвер і пятніцу вас могуць пераследаваць непаразуменні і неразуменне, будзьце максімальна сканцэнтраваныя і ўважлівыя.

**ВАДАЛІЎ.** Пастарайцеся на гэтым тыдні не паддавацца на спакусы і правакацыі. Лепш загадзя намецьце лінію сваіх паводзін і абавязкова прытрымлівайцеся яе. У сярэдзіне тыдня на рабоце магчыма пераразмеркаванне абавязкаў, у выніку чаго можаце атрымаць большую самастойнасць. У чацвер і пятніцу да вас могуць завітаць нечаканыя госці.

**РЫБЫ.** Гэты тыдзень раптоўна можа вас уцягнуць у вір падзей: актыўную перапіску з дзелавымі партнёрамі або з новым кандыдатам з сайта знаёмстваў, сустрэчы, кароткатэрміновыя паездкі. Серада пагражае аказацца адным з самых цяжкіх дзён тыдня ў псіхалагічным плане. У канцы тыдня паспрабуйце ўдзяліць хоць трохі ўвагі свайму дому, гэта ўдалы час, каб пазбавіцца ад назапашанага хламу без якіх-небудзь шкадаванняў.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.41 | 20.35 | 14.54 |
| Віцебск — | 5.26 | 20.28 | 15.02 |
| Магілёў — | 5.31 | 20.25 | 14.54 |
| Гомель — | 5.32 | 20.16 | 14.44 |
| Гродна — | 5.57 | 20.49 | 14.52 |
| Брэст — | 6.02 | 20.45 | 14.43 |

## Месяц

*Поўня 24 сакавіка. Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

*Пр.* *Аляксандра, Антона, Астапа, Івана, Марціна.* *К.* *Зіты, Феліцыі, Андрэя, Сяргея, Тодара, Тэафіла.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# ЗАЎТРА




## 27 КРАСАВІКА — Даты — Падзеі — Людзі

У краіне

**1781** год — нарадзіўся (г. Вільня) Юзаф Дашчынскі, піяніст, кампазітар і дырыжор. Выкладаў музыку ў Віленскім універсітэце. У 1814-м пераехаў у маёнтак Гарадзішча пад Мінскам, дзе на працягу 30 гадоў кіраваў сімфанічным аркестрам. Аўтар каля 100 музычных твораў, сярод якіх фартэпіянныя канцэрты, квартэты, а таксама паланэзы, якія не саступалі, на думку музыказнаўцаў, паланэзам Міхала Агінскага.

**1919** год — польскія войскі акупіравалі горад Гродна.

**1945** год — Беларусь прынялі ў склад дзяржаў — заснавальніц ААН. Дарэчы, на першым пасяджэнні, якое праходзіла ў амерыканскім Сан-Францыска, кіраўнік беларускай дэлегацыі міністр замежных спраў Кузьма Кісялёў, убачыўшы на стале таблічку «White Russia», папрасіў арганізатараў выправіць гэтую назву і па-англійску напісаў «Byelorussian Soviet Socialist Republic» (Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка), пааб'яцаўшы падрабязна расказаць пра гэтую назву, пра гісторыю Беларусі, яе поспехі на прэсканферэнцыі. Што і было зроблена.



У свеце

**1782** год — нарадзіўся Нікола Паганіні, італьянскі скрыпач і гітарыст-віртуоз, кампазітар.

**1791** год — нарадзіўся Сэмюэл Морзэ, адзін з вынаходнікаў аднадротавага электрычнага тэлеграфа, стваральнік азбукі Морзэ, мастак, адзін з заснавальнікаў і першы прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі малюнка ў Нью-Ёрку. Аднак калі ён як мастак нам практычна невядомы, то вынаходніцтвы ім у 1837 годзе электрамагнітным тэлеграфным апаратам і тэлеграфным кодам для яго (азбука Морзэ) і да сёння карыстаюцца ва ўсім свеце.

**1906** год — адбылося першае пасяджэнне Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі. Гэта быў першы ў Расіі выбраны насельніцтвам прадстаўнічы заканадарадчы орган, які стаў вынікам спробы пераўтварыць імперыю з самадзяржаўнай у парламенцкую манархію, выкліканай імкненнем стабілізаваць палітычную абстаноўку ва ўмовах шматлікіх хваляванняў і рэвалюцыйных выступленняў. Дума I склікання правяла адну сесію і праіснавала 72 дні — з 27 красавіка (10 мая) да 9 (22) ліпеня 1906 года, пасля чаго была распушчана імператарам Мікалаем II.



**1974** год — ад перона Яраслаўскага вакзала ў Маскве на будаўніцтва Байкала-Амурскай чыгуначнай магістралі адправіўся першы Усесаюзны ўдарны атрад імя XVII з'езда ВЛКСМ.

Так гаварыў...

**П'ЕР БУАСТ:**

*«Разважаць з дурнем — гэта запальваць свечкі для сляпых».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Кліент, паказваючы на начальніцу, нешта пытаецца ў супрацоўніцы. Начальніца краем вуха чуе адказ:**

**— Яна? Ды не. Яна тут не працуе. Яна тут дырэктар!**

Навучыцца танцаваць індыйскія танцы вельмі проста: адной рукой ты ўкручваеш лямпачку, а другой гладзіш сабаку.

**— Віталь, а што гэта ў цябе ўвесь твар сіні?**

**— Учора позна ўвечары на гопнікаў нарваўся.**

**— Пабіўся?**

**— Пабіўся — гэта калі і ты хоць крыху, але таксама б'еш...**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.766. Індэкс 63850. Зак. № 904.

Нумар падпісаны ў 19.30 26 красавіка 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12